**Сергіевіч В.І.,**
суіскальнік кафедры
сацыялогіі і культуразнаўства

# РАЗВІЦЦЁ СТУДЭНЦКАГА САМАКІРАВАННЯ Ў БЕЛАРУСКІМ УНІВЕРСІТЭЦЕ КУЛЬТУРЫ

Працэс дэмакратызацыі вышэйшай школы, як і пачатак працэсу рэформы вышэйшай школы, патрабуюць самага актыўнага ўдзелу студэнтаў у кіраванні вышэйшай навучальнай установай, у вырашэнні імі разнастайных вучэбных, навуковых, творчых пытанняў, а таксама пытанняў побыту і арганізацыі вольнага часу. Гэты ўдзел найбольш поўна можа выяўляцца ў студэнцкім самакіраванні. Праз удзел студэнтаў у самакіраванні мы фарміруем у будучых спецыялістаў галіны культуры арганізатарскія здольнасці, якасці кіраўніка, станоўча ўздзейнічаем на рост іх прафесійнай кампетэнтнасці, адказнасці, на іх уменне творча падыходзіць да вырашэння пытанняў.

На працягу 1997—1998 гадоў многія накірункі студэнцкага самакіравання ў Беларускім універсітэце культуры на новым узроўні былі адноўлены і сталі рэальнасцю. Студэнты пастаянна прымаюць удзел у рабоце вучонай рады універсітэта і факультэтаў, каардынацыйнай рады па справах студэнцкай моладзі і выхаваўчай рабоце, метадычнай камісіі і мастацкага савета, актыўна працуюць у самакіраванні факультэтаў і інтэрнатаў універсітэта. Імі створаны шэраг грамадскіх арганізацый.

Можна зрабіць выснову аб тым, што элементы самакіравання выяўляюцца цяпер ва ўсіх сферах дзейнасці студэнцкага калектыву: у вучобе, грамадскай, навукова-даследчай рабоце, правядзенні вольнага часу і інш.

Неабходна адзначыць: студэнты ў цэлым адэкватна рэагуюць на рэальныя змены жыццядзейнасці універсітэта, хоць усведамленне імі неабходнасці ўдзелу

ў студэнцкім самакіраванні адбываецца недастаткова хутка. Згодна з сацыялагічнымі даследаваннямі студэнтаў-першакурснікаў Беларускага універсітэта культуры, якія былі праведзены ў снежні 1996 г. групай "Сацыёлаг" пад кіраўніцтвам прафесара Л.І.Кумекай, толькі 21,3% першакурснікаў універсітэта на пытанне: "Ці збіраецеся вы ў час вучобы ў ВНУ ўдзельнічаць у студэнцкім самакіраванні?" — адказалі станоўча. 40,4% адказалі "не", і 36,2% адказалі, што пакуль не вырашылі. Паводле апытання студэнтаў, праведзенага аддзелам выхаваўчай работы ў 1998 г., гэтыя лічбы змяніліся адпаведна да 45,7% (адказалі станоўча), 20,1% (адказалі "не"), і 34% (адказалі, што не вырашылі).

З усіх універсітэцкіх узроўняў студэнцкага самакіравання найбольш важным і неабходным бачыцца ўзровень факультэцкі, паколькі факультэт з'яўляецца галоўнай структурнай адзінкай, дзе замыкаюцца асноўныя сувязі ў складанай сістэме ўзаемаадносін "студэнт — ВНУ". Студэнцкае самакіраванне на факультэтах універсітэта знаходзіць практычнае ўвасабленне ў рабоце студэнцкага савета факультэта.

Склад студсаветаў залежыць ад спецыфікі факультэта і Беларускага універсітэта культуры як вышэйшай навучальнай установы ў цэлым. У студсаветы факультэтаў уваходзяць старасты акадэмічных груп, кіраўнікі студэнцкіх прафсаюзаў, старшыні факультэцкіх арганізацый БСМ і БПСМ, студэнты, якія прадстаўляюць факультэт у вучонай радзе, каардынацыйнай радзе, мастацкім савеце універсітэта і факультэта, а таксама прадстаўнікі творчых калектываў, грамадскіх аб'яднанняў і клубаў па інтарэсах.

Сярод важнейшых задач, якія вырашаюць студсаветы факультэтаў, можна вылучыць наступныя:

1. Дапамога кіраўніцтву факультэта ў планаванні вучэбна-выхаваўчай работы.

2. Актывізацыя студэнтаў факультэта ў вырашэнні задач рэалізацыі планаў, кантролю наведвання вучэбных заняткаў.



Рэпазіторый БДУКІ

3. Удзел у рабоце стыпендыяльных камісій, камісій па размеркаванні студэнтам прэмій і іншых заахвочванняў за поспехі ў вучобе, актыўны ўдзел у грамадскай, творчай, навукова-даследчай рабоце, дасягненні ў спорце і інш.

4. Сувязь студэнтаў факультэта з арганізацыямі і структурнымі падраздзяленнямі універсітэта дзеля іх каардынацыі і паўнацэннага ўзаемадзеяння.

Вельмі важным з'яўляецца таксама ўзровень студэнцкага самакіравання ў інтэрнатах універсітэта. У Беларускім універсітэце культуры ёсць шэраг службовых асоб, якія па сваіх прафесійных абавязках павінны ажыццяўляць функцыі кіравання інтэрнатамі, праводзіць у іх выхаваўчую работу (загадчыкі інтэрнатаў, выхавацелі, намеснікі дэканаў па выхаваўчай рабоце, загадчыкі спартклубам і студклубам, аддзелам выхаваўчай работы, прарэктар па выхаваўчай рабоце і інш.). Але іх дзейнасць абмежавана ў асноўным межамі рабочага дня. Адзіным прадстаўніком адміністрацыі ў перыяд, калі ўзнікаюць праблемы, нават эксцэсы ў жыцці інтэрната, з'яўляецца вахцёр. Станоўчым бачыцца ўвядзенне ў інтэрнатах кругласутачнай аховы. Але ў апошняй ёсць спецыфічныя, абмежаваныя інструкцыяй, абавязкі па захаванні прапускнога рэжыму, грамадскага парадку. Таму сапраўднымі гаспадарамі студэнцкага інтэрната павінны быць яго жыхары. На жаль, практыка паказвае: у асноўнай масы студэнтаў пачуццё гаспадара ў поўным сэнсе гэтага слова адсутнічае. Вось чаму галоўнымі мэтамі выхаваўчай работы ў інтэрнаце павінны быць выхаванне гаспадара, выпрацоўка адказнасці за ўсё, што адбываецца, праз актыўнае прыцягненне студэнтаў да кіравання інтэрнатам. Асноўныя метады для гэтага — пашырэнне і актывізацыя структуры студсаветаў інтэрнатаў, наданне ім шырокіх паўнамоцтваў. Рашэнні студсавета інтэрната, напрыклад, абавязковыя для выканання ўсімі жыхарамі інтэрната, калі не супярэчаць дзеючаму заканадаўству, нарматыўным дакументам Міністэрстваў культуры і адукацыі, "Правілам пражывання ў інтэрнатах Беларускага універсітэта культуры", загадам рэктара.

Рэпазіторый БГУКІ

Дзейнасць студсаветаў інтэрнатаў накіравана на вырашэнне трох асноўных узаемазвязаных задач:

1. Дапамога адміністрацыі ў стварэнні добрых бытавых умоў для жыхароў.

2. Арганізацыя дзяжурства студэнтаў на вахце і паверхах з мэтамі падтрымання парадку і дысцыпліны, кантролю за выкананнем студэнтамі нормаў пражывання ў інтэрнатах.

3. Удзел у арганізацыі вучобы і адпачынку студэнтаў.

Своеасаблівай часткай студэнцкага самакіравання з'яўляюцца грамадскія арганізацыі. Універсітэт мае пэўны вопыт іх дзейнасці. Прафсаюзная арганізацыя студэнтаў, пярвічныя арганізацыі БПСМ і БСМ, навуковыя студэнцкія аб'яднанні, клуб вясёлых і знаходлівых, аператыўны атрад, творчыя аб'яднанні і калектывы працуюць у цеснай узаемасувязі з іншымі ўзроўнямі студэнцкага самакіравання. Іх дзейнасць, у сваю чаргу, арганізуецца на аснове самакіравання. Грамадскія студэнцкія арганізацыі, працуючы ў цесным кантакце са структурнымі падраздзяленнямі універсітэта, іншымі органамі студэнцкага самакіравання, могуць актыўна ўдзельнічаць у працэсе выхавання студэнтаў.

Усе ўзроўні студэнцкага самакіравання ва універсітэце дзейнічаюць у адпаведнасці са статутам універсітэта, дзеючым заканадаўствам, а таксама "Палажэннем аб студэнцкім самакіраванні Беларускага універсітэта культуры". Ва універсітэце існуе пэўная сістэма студэнцкага самакіравання, здольная вырашаць пастаўленыя перад ёй задачы. Але дасягнуты ўзровень развіцця студэнцкага самакіравання яшчэ недастатковы, перспектывы яго ў значнай ступені не вызначаны і праблема развіцця студэнцкага самакіравання патрабуе вывучэння, аналізу і ўдасканалення. Патрабуюць тэрміновага вырашэння многія праблемы.

Сярод іх вылучаюць такія, як:

1. Адсутнасць планавага мэтанакіраванага фінансавання выхаваўчых мерапрыемстваў, розных паводле ўзроўню і накіраванасці.

Репозиторий БГУКИ

2. Адсутнасць сістэмы вывучэння асобы студэнта, яго жыццёвых ідэалаў і патрэбнасцей.

3. Адсутнасць практычнага ўвасаблення ў практыку дакладнай структуры студэнцкага самакіравання.

4. Слабая тэарэтычная падрыхтоўка ўсіх супрацоўнікаў універсітэта, якія ўдзельнічаюць у арганізацыі студэнцкага самакіравання і выхаваўчага працэсу.

**Шумская І.М.,**
аспірантка кафедры
сацыялогіі і культуразнаўства

## МУЗЫКА Ў СІСТЭМЕ СУЧАСНАЙ МАСТАЦКАЙ КУЛЬТУРЫ

Рэпазіторый БГУКИ

Значнае павышэнне інтэнсіўнасці жыцця чалавека і дынаміка сацыяльных працэсаў, якія адбываліся на працягу XX ст., паспрыялі таму, што ў сістэме мастацкай культуры выявіўся шэраг цікавых тэндэнцый. Гэта, па-першае, вяртанне да мастацкага сінкрэтызму, увасобленае ў сучасным сцэнічным і кінематаграфічным мастацтвах, у перфомансах, масавых шоу. Па-другое, пацвярджэнне на навуковым узроўні сінергетычнага ходу развіцця культуры. І, па-трэцяе, неаспрэчвальнасць такой нестандартнай з’явы, як тэхнакратызацыя мастацтва.

Відавочна, характэрнай рысай сучаснай мастацкай культуры можа служыць актыўнае выкарыстанне ў ёй камп’ютэрных тэхналогій. Новыя інавацыйныя магчымасці зрабілі моцны ўплыў на развіццё графікі і дызайну, архітэктурнага канструявання і кінематаграфіі, але найбольш істотная іх рэалізацыя адбылася ў музычнай культуры.

Эксперыментальная камп’ютэрна-акустычная музыка як адзін з “авангардысцкіх” напрамкаў мастацтва з’явілася на падставе санорнай інструментальнай і сінтэзатарнай электроннай музыкі ў сярэдзіне XX ст. і ў далейшым распалася на шэраг розных дактрын. Найбольш важныя з